# ПОЛАЦКА-ЛЕПЕЛЬСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗОНА

**Дата існавання:** восень 1942 года – 11 красавіка 1944 года

**Месца:** Беларуская ССР, Віцебская вобласць, Ушацкі раён, Лепельскі раён, Ветрынскі раён, Полацкі раён, Глыбоцкі раён, Докшыцкі раён, Бешанковичцкі раён, Сіроцінскі раён, Шумілінскі раён, Вілейская вобласць, Пліскі раён.

**Цэнтр:** г. Ушачы

**Партызанскія фарміраванні:**
«1-я Антыфашысцкая партызанская брыгада»,
2-я Ушацкая брыгада імя П. К. Панамарэнкі,
брыгада «16-я Смоленская»,
брыгада «За Савецкую Беларусь»,
брыгада «Імя К. Я. Варашылава»,
брыгада «Імя А. Ф. Данукалава»
брыгада «Імя С. М. Кароткина»,
брыгада «Імя У. І. Леніна»,
брыгада «Імя П. К. Панамарэнкі»,
брыгада «Імя А. В. Суворава»,
брыгада «Імя УЛКСМ»,
брыгада «Імя ЦК КП(б)Б»,
брыгада «Імя У. І. Чапаева»,
брыгада «Кастрычнік»,
брыгада «Лепельская імя І. В. Сталіна»,
«Дыверсійная брыгада асобага прызначэння імя У. І. Леніна»,
Смаленскі партызанскі полк,
Чашніцкая быгада «Дубава» і інш.

**Полацка-Лепельская партызанская зона** (восень 1942 – 11.04.1944) – вызваленая ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў тэрыторыя Беларусі, якая ўтварылася ў выніку скаардынаваных баявых дзеянняў партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Ушацкага раёна, значнай часткі Лепельскага, Ветрынскага, Полацкага, Бешанковіцкага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Сіроцінскага і Шумілінскага раёнаў Віцебскай вобласці, Пліскага раёна Вілейскай вобласці.

Цэнтрам вызваленай партызанскай зоны стаў горад Ушачы.

Актыўныя дзеянні партызан Ушаччыны і суседніх раёнаў восенню 1942 года прывялі да ачышчэння значнай тэрыторыі, на якой была ўтворана партызанская зона. Яна прасціралася ад Полацка на поўначы да Лепеля на поўдні, ад граніц Вілейскай вобласці на захадзе да ракі Заходняя Дзвіна на ўсходзе. Плошча зоны складала 3,2 тыс. км$^2$, дзе ў 1220 населеных пунктах пражывала каля 80 тыс. чалавек, у тым ліку бежанцы з іншых раёнаў. У склад партызанскай зоны ўваходзіла поўнасцю тэрыторыя Ушацкага раёна і часткова тэрыторыі суседніх з ім Бешанковіцкага,

Лепельскага, Докшыцкага, Глыбоцкага, Пліскага, Ветрынскага, Полацкага, Сіроцінскага и Шумілінскага раёнаў.

У кастрычніку 1943 года ў адпаведнасці з рашэннем Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) у Полацка-Лепельскай зоне арганізуецца аператыўная група ЦК КП(б)Б і Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) для каардынацыі дзейнасці партызанскіх брыгад. Кіраўніком гэтай групы быў прызначаны У. Е. Лабанок. З восені 1943 года ў зоне дзейнічала 16 партызанскіх брыгад, якія аб'ядноўвалі больш за 17 тысяч народных мсціўцаў. Вакол партызанскай зоны была створана суцэльная абарончая лінія, агульная працягласць якой складала каля 240 км. Партызанскія фарміраванні, якія ўваходзілі ў Полацка-Лепельскую зону пад агульным камандаваннем аператыўнай групы, сталі называць Полацка-Лепельскім партызанскім злучэннем. Штаб партызанскага злучэння размяшчаўся ў раённым цэнтры Ушачы.

У партызанскай зоне была адноўлена савецкая ўлада, у розны час тут базіраваліся Ушацкі, Лепельскі, Ветрынскі, Докшыцкі, Пліскі, Бешанковіцкі, Сіроцінскі падпольныя райкамы партыі і камсамола. Працавалі 6 млыноў, 3 электрастанцыі. Два шкіпінарна-дзягцярныя заводы выраблялі зброевыя змазачныя матэрыялы і запальныя сумесі для барацьбы з варожай тэхнікай. 80 кузняў і слясарных майстэрань рамантавалі і рабілі зброю, сельскагаспадарчы інвентар. 60 гарбарных прадпрыемстваў выраблялі скуры для абутку, збруі, амуніцыю. Сталярна-бандарныя майстэрні забяспечвалі лыжамі, прыкладамі для вінтовак і аўтаматаў, рамантавалі сані, фурманкі, драбіны. На 20 маслазаводах перараблялі не толькі малако, але і льнасемя. Былі арганізаваны 6 рыбалоўных арцелей. Да паслуг насельніцтва была адкрыта бальніца. Важнай справай для партызан і жыхароў зоны былі сельскагаспадарчыя работы. Насельніцтва арганізавана пастаўляла партызанам хлеб і іншыя прадукты. Партызаны ў сваю чаргу аказвалі неабходную дапамогу жыхарам у правядзенні веснавой сяўбы і ўборачных работ.

Рады партызан у зоне павялічваліся за кошт партызанскіх брыгад суседніх раёнаў. Яны сцягваліся сюды бараніць зону, якая стала важным аператыўным плацдармам для Чырвонай Арміі ў час вызвалення рэспублікі. Па стану на 11 красавіка 1944 г. тут пад адзіным камандаваннем дзейнічалі наступныя партызанскія брыгады: брыгада «За Савецкую Беларусь», брыгада «Імя У. І. Леніна», брыгада «16-я Смаленская», брыгада «Імя В. І. Чапаева», Смаленскі партызанскі полк, брыгада «Імя К. Е. Варашылава», брыгада «Імя УЛКСМ», брыгада «Імя С. М. Кароткіна», брыгада «Імя А. В. Суворава», брыгада «Кастрычнік», брыгада «Імя ЦК КП(б)Б», «Дыверсійная брыгада імя У. І. Леніна», «1-я Антыфашысцкая партызанская брыгада», брыгада «Імя А. Ф. Данукалава» («Аляксея»), брыгада «Лепельская імя І. В. Сталіна», брыгада «Імя П. К. Панамарэнкі».

Важную ролю ў кіраўніцтве буйнымі партызанскімі сіламі адыгрывала сувязь. Яна была differentрознабаковай і добра наладжанай – конная, тэлефонная, па радыё. Існаваў і паветраны мост, для якога партызаны пабудавалі аэрадромы, пасадачныя пляцоўкі. Партызанскія аэрадромы дзейнічалі каля вёсак Сержаны, Двор Пліна, Ушацкага льнозавода. Пасадачныя палосы – каля вёсак Загор'е, Ляхавічы, Віркі, Пастрэжжа і інш.

Партызаны Полацка-лепельскай зоны кантралявалі амаль усе шасэйныя дарогі свайго рэгіёна, рабілі на іх засады, узрывалі масты, знішчалі правадную сувязь. Адначасова яны праводзілі баявыя аперацыі па разгрому варожых гарнізонаў у прылягаючых да партызанскай зоны гарадах і буйных населеных пунктах. Праводзілісся шматлікія дыверсій на чыгунцы.

Актыўныя баявыя дзеянні партызан Полацка-Лепельскай зоны наносілі вялікі ўрон не толькі нямецкім тылавым часцям і падраздзяленням паліцыі, але і 3-й нямецкай танкавай арміі, якая размяшчалася ў раёне Віцебска. Гітлераўцы неаднойчы спрабавалі ліквідаваць зону. Толькі ў снежні 1943 – лютым 1944 гг. яны правялі 5 карных аперацый. Аднак партызаны гераічна адбівалі ўсе атакі, акрамя таго, у ходзе баявых дзеянняў разграмілі больш за 30 варожых гарнізонаў, пусцілі пад адхон 40 эшалонаў праціўніка, знішчылі 329 аўтамашын з жывой сілай і боепрыпасамі.

У пачатку вясны 1944 г. нямецкае камандаванне прадпрымае новую спробу знішчыць Полацка-Лепельскую партызанскую зону. У красавіку пачынаецца самая маштабная карная аперацыя супраць партызан пад назвай «Веснавое свята». У задачы гэтай карнай аперацыі ўваходзіла цалкам ачысціць Полацка-Лепельскую зону як ад партызан, так і ад мірнага насельніцтва, якое меркавалася вывезці ў Германію – усіх працаздольных і дзяцей, астатніх знішчыць. У аперацыі фашысты задзейнічалі каля 60 тысяч чалавек, у тым ліку каля 20 тысяч складалі вайсковыя часці вермахта, 137 танкаў, 235 гармат, каля 70 самалётаў, 2 бронецягніка. У ходзе аперацыі ажыццяўлялася поўная кругавая блакада занятых партызанамі тэрыторый з бесперапынным іх сціскам да цэнтра ва Ушачах. На захопленых тэрыторыях праводзіліся карныя дзеянні. Карнікам супрацьстаяла 16 партызанскіх брыгад агульнай колькасцю 17185 чалавек, на ўзбраенні ў якіх было 9344 вінтоўкі, 1544 аўтаматы, 634 ручныя і 97 станковых кулямётаў, 151 процітанкавае ружжо, 143 мінамёты і 21 артылерыйская гармата. Агульная працягласць лініі партызанскай абароны складала 230 км.

Кальцо блакады вакол Полацка-Лепельскай партызанскай зоны цалкам самкнулася 11 красавіка 1944 г. Праціўнік выступіў з боку Полацка, партызаны былі вымушаны прыняць няроўны бой. Цяжкія баі ва ушацкіх лясах працягваліся амаль 25 дзён. Да канца красавіка карнікам удалося скараціць мяжу партызанскай абароны да 20 км, рэшткі партызанскіх брыгад сканцэнтраваліся на невялікім участку ў Матырынскім лесе. З кожным днём палажэнне партызан пагаршалася. У ноч з 4 на 5 мая 1944 года, сабраўшы апошнія сілы, Полацка-Лепельскае злучэнне ажыццявіла прарыў з блакады ў паўднёвым кірунку паміж вёскамі Паперына і Новае Сяло, дзе абарона немцаў была моцна ўмацавана і яны не чакалі партызан. Нягледзячы на вялікія страты, партызанам удалося вырваца з акружэння і захаваць за сабой частку вызваленай тэрыторыі. Яны па-ранейшаму заставаліся сур'ёзнай пагрозай для вермахта, захавалі сувязь з войскамі Чырвонай Арміі.

Зона заставалася пад кантролем партызан амаль да поўнага вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Барминский, В.** Круги войны / В. Барминский. – Минск : БГУ, 2018. – 119 с.

**Головко, С.** Прорыв в бессмертие / С. Головко // Беларуская думка. – 2014. – № 5. – С. 34–40.

2. **Жолуд, С.** Два прарывы… / С. Жолуд // Беларуская думка. – 2019. – № 4. – С. 28–33.

3. **Кірпіч, М. М.** Партызанскі плацдарм / М. М. Кірпіч, Р. А. Чарнаглазава // Памяць: Ушацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў [і інш.] ; уклад. М. М. Кірпіч ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Белта, 2003. – С. 190–191.

5. **Лобанок, В. Е.** Партизаны принимают бой / В. Е. Лобанок. – М. : Политиздат, 1972. – 304 с.

6. **Партизанские** зоны // Беларусь партизанская = Guerrilla Belarus : иллюстрированная энциклопедия партизанского движения в Беларуси в годы Великой Отечественной войны / под общ. ред. А. М. Литвина ; пер. на англ.: А. В. Титова, Н. Ю. Жданова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2019. – С. 91–101. – (Беларусь помнит: во имя жизни и мира).

7. **Полоцко**-Лепельская оперативная группа ЦШПД и БШПД // Высшее партизанское командование Белоруссии, 1941–1944 : справочник / Э. Г. Иоффе [и др.]. – Минск : Беларусь, 2009. – С. 135–139.

8. **Языковіч, Э. Ф.** Полацка-Лепельская партызанская зона / Э. Ф. Языковіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 502.